
Любви дарующей крыло



Пружаны. 2009г.



Для сябе і пра сябе ўслых.

Я нарадзілася ў сям'і, дзе было ўжо дзве сястры. Пасля мяне нарадзілася яшчэ малодшая. У бацькі не было сына, над ім мужыкі часта насміхаліся. Але той любві, якую ён нам аддаваў, можна было пазайздросціць.

Слова "любоў" паміж бацькам і маці не чулася, але магнетызм гэтага пачуцця адчуваўся ва ўсім. І нам, чатыром дзяўчаткам, было ўтульна і цёпла ў промнях гэтай любові. Можа таму Васілёвы дочкі мелі кожная сабе які-небудзь талент: вышыванне крыжыкам і гладдзю, малюнак крэйдамі, дзіўны на ўсё сяло голас, нават касіць і хадзіць за плугам умелі. Маці на той цяжкі час прыбірала нас з густам, швейная машынка "Зінгер" пад рукамі маці стварала прыгожыя уборы. У іх мы шыкавалі ўсім на зайздрасць.

Да гэтага часу ўдзячна бацькам за іх вялікую і чыстую любоў. Гляджу на фота, дзе яны ўдваіх, ужо старыя, дзе бацька трымае па-польску маці за руку. Паклон Вам нізкі. Ўсё жыццё нясу, як святы дар, Вашу любоў да ўсяго, што мне люба і міла.

Ніна Дыдышка

Свет любви



О любви

Почему пишу я о любви?
Потому что в ней такая сила,
Что дала мне жизнь
Прожить сполна,
Не сломала и не погубила

***

Ключ всегда оставляла в дверях:
Вдруг в дом зайдёт счастье.

Стары друг

Пазваніў і зайшоў да мяне стары друг,
Прабачэння прасіў і сказаў:
“Усё ідзе на свой круг.
Вось гады прабягаюць,
Не стрымаць, не вярнуць.
А к табе, дарагая, самі ногі вядуць.
І нічога не трэба – на цябе паглядзець,
Памаўчаць – зразумееш,
І радком пасядзець.
Не гані, бо вярнуся,
У душы даўно твой.
На жыццё аглянуся –
Адзін сум, адзін боль”
Яго словы ўсе я даўно ўжо знаю,
Пашкадую ў душы і к другой адпускаю.

Разлука

Нитка бус разорвалась –
Нам её не связать.
И любовь потерялась –
Почему? Не понять.
Ты грустишь о минувшем,
Боль твою не унять.
Я спешу идти по жизни,
И меня не сдержать.
Видно, нитка не крепка
И не прочна была,
Что так быстро порвалась,
Нас с тобой развела.

Три слова

посвящается Ж.

Я тебе буду петь,
Ты меня будешь слушать.
Твою душу взволнуют
Моей песни слова.
И не вся моя песня,
А коротких три слова,
Откровенных три слова –
«Не хватает тебя!»
Утром, вечером, в синем тумане,
В холод, в слякоть, в жару
Три коротеньких слова моих
Будешь помнить.
Я тебе навсегда их дарю.

* * *

Хацела б я па вечарах
У сваім утульным цёплым доме
Сядзець і слухаць, як на дах
Сядаюць птахі, мроіць долю.

І задаволенаю быць
Сваёю доляю-юдоллю.
І у крэсле да агменю плыць,
Глядзець, як полымца сваволіць.

Каханы муж…А вось і ён..
“Твая вячэра, дарагая,
Любімы з клёцкамі булён”.
Мой любы так мяне кахае.

Бакал сталовага віна,
З лімонам чай, чырвоны яблык.
Я так сядзела б давідна,
А ўсё астатняе…да д’ябла.

Хацела б я па вечарах….



Он такой

Говорят, для тебя он всё делал,
Говорят, надышаться не мог он тобой.
А теперь ты одна в этой жизни короткой,
А теперь он не твой, он – с другой.

Говорят, он другой уже ноги целует
И другой дарит утром цветы.
Ну, зачем эти горькие слёзы?
Кто в потере – он или ты?

***

А вы не спросили…

Светлана Кузнецова

А вы не спросили, как все эти годы
Жила я, что ела, пила.
Работа как ладилась, время летело,
Как в доме уют я вила.

А вы не спросили, когда-то родной и желанной,
Как трудной душой я жила,
Всё тучи и тучи, всё темень сквозная,
А я свет и солнце ждала.

А вы не спросили, ну, что ж, и не надо.
Не надо, такие дела.
Зачем же стучитесь теперь в мои двери,
Когда к вам подкралась беда?

5.06.09.

Сила.

Скажи, мужчина, в чём же твоя сила:
В слове или в деянии?
В нежности или в раздевании?
Во взгляде глаз непокорных, но притягательных?
В движениях рук, точных и ласкательных?
Скажи, мужчина, в чём же твоя сила,
Которая женщину внезапно поразила?

Она просила…

Когда говорила и просила:
-Не разлюби. Не уходи. Будь мой.
Но жизнь так исковеркала и повернула,
Заставила уйти тебя самой.

Да и в багаж твой положила
Немало слёз, обид, потерь,
А ведь гадалка говорила:
-Счастливой будешь, мне поверь.

Она и верила. Стремилась, достигала,
Теряла. Обретала всё опять.
Жизнь караулила. Подстерегала,
Что б зачеркнуть всё и отнять.

Не будет больше состязания.
Смирилась женщина с своей судьбой,
Но в тайниках души печальной
Ей всё же верится:
-Он мой.

“Если хочешь, чтобы тебя любили – люби!”

Сенека

Не встречайтесь с первою любовью.
Пусть она останется для вас
Синей птицей, улетевшей в небо,
Иль свечою, догоревшей поздний час.
Поднимаясь утром и на сон прощаясь,
Говорите милые слова
Той, которая давно уж с вами,
А не той, которая одна.
Не помчались к ней вы, не позвали,
А оставили на произвол судьбы.
Вот теперь считайте сердца сбои
И напрасно прожитые дни.

Август 1997г.

Средиземное море. Пор Лё Кат, дача.

Море плещет о берег,
Бьёт о берег волной.
Мы с тобой снова вместе
Ловим брызги рукой.
Ветер нежно ласкает,
Солнце жаром печёт.
На волне жизнь умчалась,
Не стоит, а течёт.
Я ловлю счастья брызги –
Снова вместе с тобой.
Эту встречу и радость
Увезу я с собой.



Апрель 2005г.

Сирени ветки хмельные.

Умчались ветры зимние, уснули снеги белые,
Опять стучит-стучит весна.
А я стою у зеркала, а я смотрюсь у зеркало –
Не волосы, одна лишь седина.

Когда-то ветки хмельные, сирени ветки белые
Звали на тропочку меня,
Где целовал и обнимал, любимой нежно называл,
Сползала с плеч косыночка моя.

Сирени ветки белые цветочки все осыпали,
Прошла и молодость моя.
А я смотрю на тропочку, где ходишь ты торопишься,
А рядом в садик внученька твоя.

Платочек тот запрятанный на плечи вновь наброшу я,
Лебедушкой по тропочке пройду.
Быть может , мне ты встретишься,
Легонько так поклонишься,
А я как будто крылья обрету.
Сирени ветки хмельные…
Сирени ветки белые…

***

Губы твои пахнут горечью, холод в них, что лёд.
Было время – любили, губы сладко топили
В тобою растопленный мёд.

***

***

К тебе одной летит моя мечта.
К тебе одной душа моя стремиться.
Ну почему ты далеко?
Кто дал нам право разлучиться?

А у нас цветёт сирень,
И тополиный пух везде кружиться.
А завтра придёт новый день
И даст надежду не журиться.

Всё тот же в доме телефон,
Но он молчит, ждёт воскресенье:
Услышу голос твой и смех,
И тихий шепот в утишенье.

Наверно так устроен мир…
Судьба ведь потому судьбой зовётся,
Что испытанья принесёт,
Потом в миг счастьем обернётся.

Испания 2002г.

***

Мне кажется, со мною было всё: любила, мучалась, сгорала.
Но годы доказали мне и то, что я любви своей – не добрала.

***

Ю.В.

Вы говорили :”Вы намного старше и нам встречаться не резон”
Но я глазами говорила:”Ваша” и мы бросались напролом.
Были заботы и обиды, и слёзы были невпопад.
А вот сейчас душа омыта и сердце как осенний листопад.
Я не в обиде. То , что было, осталось в нас на много лет.
И пусть уже давно не вместе, и пусть горит прощальный свет…
Но просыпались рано утром, смеясь бежали кто куда,
Чтоб вечером собраться снова – минута кажда дорога.

***

Не правда ли, все вышло просто:
Уехали, надежду увозя.
И снова одиночество и сумрак
Всю душу затопили мне сквозя.
Ну что поделаешь.. Вы далеко,
Забыли думать обо мне сейчас.
Свои заботы и свои сомненья
Разъединили снова нас.
Я не виню вас и не укоряю,
За то, что было, я благодарю.
И если беды вам случатся и несчастья,
Я вас всегда у двери подожду.



Франция. 2002г.

***

Когда мучит тоска - не сдавайся,
Когда горе придёт - отгрусти.
Только белых седин не пугайся
И за рюмкой вина не сиди.

Когда все вдруг друзья отвернуться,
Позабудут подруги тебя -
Подставь солнцу лицо, свою душу
И цепляйся за жизнь, всё любя.

Почему говорю так о жизни?
Потому что я знаю в ней толк!
Жизнь должна веселить и искриться,
Как на женщине праздничный шёлк.



***

Любить - это значит
Гореть во гне
Ежечасно и ежеминутно.
Падать в пропасть страстей
И не думать о том где уютней.
Любить – значит жить.


О любви.

Почему пишу я о любви?
Потому что в ней такая сила,
Что дала мне жизнь
Прожить сполна,
Не сломала и не погубила.

***

Спяшайцеся любіць. Тварыце любоў. Няхай гэта пачуццё будзе узаемным, шчырым і светлым. Тады ваша жыццё будзе поўніцца згодай пад Божым небам.

ЦЫКЛ “ЖАНОЧЫ ЛЁС”



Кара лёсу.

Кажуць, быць прыгожай жанчынай – гэта вялікае шчасце, гэта сам Бог пазначыў сваёй міласцю.

А яна, гэтая жанчына, была на самай справе прыгожай. Абаяльная сама і імя мела ласкавае – А-ню-та. Так і хацелася яго вымаўляць працягла, каб яно лашчыла сэрца, грэла душу. А вока тым часам з замілаваннем глядзела на яе зграбную постаць, на загарэлыя ногі. І пята ў яе была кругленькая, утульна ўладкоўвалася ў басаножак без задніка, а маленькія пальчыкі неяк сарамліва выглядалі на свет з-пад белай скуры шыкоўнага абутку.

Рукі вышэй локцяў былі не поўныя і не худыя. Анюта любіла, каб яны былі адкрытыя як і шыя, на якой заўсёды пераліваася залатая цэпка ці матава паблісквалі пацеркі з натуральнага каменя. Пра грудзі і гаварыць боязна. Па спіне сцякалі саламянай хваляй густыя валасы. Іх яна спераду гладка прычэсвала, і гэтая прычоска надавала твару нейкую ўрачыстасць і строгасць. Ды і вочы – сам блакіт – глядзелі сур'ёзна і вывучальна. А бывала так, што развяселіцца, звонка-звонка засмяецца, паказаўшы белыя, бы цукар, зубы, а з вачэй градам так і сыплюцца іскрынкі. Яны тут жа запальваюць вакол сябе ўсмешку людзей і добры настрой. І нейкі ток пранізвае цела, яно дранцвее, становіцца непадуладным. Ты заміраеш на месцы і любуешся гэтай мілай жанчынай. О, гэтую жанчыну я даўно ўжо кахаў, яшчэ з дзеўкаў, але лёс мне паказаў вялікую дулю, пасмяяўся з мяне, як мог, наздзекваўся: я жыву ад яе праз плот, маю свой дом, жонку, дзяцей. Мой пушысты кот часта спіць у яе на прыполе, калі яна сядзіць на сваім ганачку на зыходзе сонца. Горш тое, што сама Анюта глядзіць на мяне, як на звычайнага суседа. А можа інакш?

Вось і жыву з гэтай прыгожай адзінокай жанчынай ужо шмат гадоў побач і не знаю, як утаймаваць сваё сэрца, прывесці яго да нармальнага рытму і ціску.
Можа, у вас знойдзецца спачуванне і адказ?

Боль сэрца.

Утульны пакойчык. На стале кніжкі, стосік сшыткаў. Я сяджу на канапе і моўчкі чакаю працяг размовы. Кубачак гарбаты дрыжыць у руках гаспадыні. Часам яна паглядае ў акно на бель зімы. Гэта яе як бы супакойвае. Яна працягвае гаварыць пра той час, які нанёс яе сэрцу вялікі боль, зрабіў яго хворым, неспакойным. Яна не асуджае, не папракае, а ўспамінае так усё, як было.

Муж прыйшоў з работы нейкі сур’ёзны, задумлівы. Вячэраў без ахвоты, не падняў вачэй і не падзякаваў, калі выйшаў з-за стала. Нейкая трывога пачала біць яе нястрымна, не правяраліся сшыткі. З яго пакою чуліся крокі туды-сюды. Раптам яго постаць з’явілася на парозе, рашуча, як бы адсякаючы, ён вымавіў: “Я цябе пакідаю. Еду да другой жанчыны. Забяру тое, што лічу патрэбным”. І пачаў пералік гэтай патрэбы. Атрымлівалася, што жонцы і дзецям нічога не трэба, а вось яму для новага жыцця многае спатрэбіцца.

Усе гэтыя словы даходзілі бы праз вату, у вушах гучала толькі фраза: “Я цябе пакідаю”, ды ныла, пякло болем сэрца, а раней жа ніколі так на балела. За што? Чаму? Можа, дзень такі, можа памылілася, недачула. Але ж ён гаворыць, працягвае гаварыць. Вось, паедзе, канчаткова вырашыў, пэўная надзея на другую. І не таму, што тая маладзейшая, што больш да спадобы, відаць, перагарэла ўсё да яе, сённяшняй, плануе з будучай жанчынай.

Ціха слухала, ні слёз, ні папрокаў, толькі рука трымала сэрца, якое не магло, не хацела мірыцца са страшнымі словамі здрады. Прыйшла сумная думка: і каб у маладыя гады, то зразумела. А гэта ў другой палове жыцця, калі наперадзе менш, чым ззаду.

Муж часцей і падоўгу затрымліваўся перад люстэркам, старанна і падоўгу падбіраў, завязваў гальштук, разглядаў свой твар, дзівіўся на сябе. З работы стараўся хутчэй папасці ў свой пакой і там закрыцца, схавацца ад яе, застацца аднаму са сваім раптоўным каханнем – сустрэчай. Ён быў шчаслівы і радасны, што тая, другая, вось як яго ацаніла, выдзеліла, адчула, што ў яго ёсць сіла і маладосць. Часта дадому муж прыносіў новыя рэчы і складаў у сакваяжык: рыхтаваўся да ад'езду.

І паехаў. Пакінуў жонку, дарослых дзяцей (яны зразумеюць яго душу), унукаў. Яе жыццё стала прыклым, самотна глядзела на белы свет, не было асалоды і ў працы, з нейкай помстай парэзала на дзве часткі фоткі з альбома: яна і ён, каб усё асобна.

Часу прайшло мала, як цяпер ужо былы муж вярнуся назад у хату. Нейкі знікшы, пануры, у нясвежай кашулі. Гаварыць многа не хацеў: "Новая запатрабавала грошы на еўрарамонт, а тут і сын вярнуўся з арміі, яшчэ ёй захацелася дачу каб ён прадаў, выкрылася яе жаночая хвароба. Не зладзілася, не прыцёрлася. Вярнуўся".

Пачалі жыць па-ранейшаму. Па-новай распісаліся, клопат аб ім, сям'я, праца – час бег.

Мала таго часу прабегла. Лёс распарадзіўся па-свойму: нядоўга прыйшлося яму хварэць.

У прыгожым месцы пахавала яго жонка і дзеці. Прастор. Кветкі, усё дагледжана і прыбрана. Маленькая

лавачка, на якой можна пасядзець і падумаць. Але што тут думаць: сэрца ўсё прасціла, толькі вось балець пачало пякуча...

НЕ ЦЯЧЭ РАКА НАЗАД.

Разамлелае сонца быццам застыла ў нерухомай вышыні. Не было чым дыхаць, пот каціў градам. Люся сядзела на лаўцы школьнага скверыка і чакала яго, свайго першага ў жыцці мужчыну. Час ішоў марудна. Яго ўсё не было і не было. Яна ўжо пачала хвалявацца: няўжо не вырвецца і не прыйдзе? Бацька ж абяцаў яго адпусціць для размовы. Вайсковая часць побач, нейкі плот толькі раздзяляе іх. Яе Валодзя служыць тут, нясе тэрміновую службу ў пагранічніках. А пагутарыць ой як трэба. Яна расказала бацькам, праўда, без падрабязнасцей, што стала жанчынай у гэты выпускны баль, што больш у гэтым віны, а можа, настойлівасці было ад яго, музыканта вайсковага ансамбля. Знаёмы яны даўно, яго служба надыходзіць к канцу, хутка яму ўжо ехаць дамоў, у Львоў. Люся прыказала яму напісаць маці пісьмо, паслаць яе фотакартачку. Ды і сама склала пісьмо для Валодзевай маці, не пашкадавала ліслівых слоў аб яе сыне, напісала, што жыць могуць у яе бацькоў. Напісала, але не адаслала, бо чакала сустрэчы з хлопцам-салдатам. А ён затрымліваўся, бо стаяў у кабінеце камандзіра, выцягнуўшы рукі па швах. За сталом сядзеў і бацька Люсі, ён маўчаў, за яго гаварыў камандзір. Валодзі даваўся тэрмін для таго, каб распісацца з Люсяй, каб усе непрыемнасці, якія яго могуць чакаць, былі закрыты загсам. Ніхто не сказаў і слова аб яго выдатнай службе, пятно-пляма лажылася на яго сумленне за нестрыманасць да

дзяўчынкі-выпускніцы. Выходзіла так, што яму, байцу-пагранічніку, трэба парадніцца вось з гэтым, у пагонах са звёздамі, стаць зяцем вайсковага начальства. Ну і Люська! Што ж яна нарабіла! Так цалавала, так спяшалася напаіць яго хмелем свайго цела, што ён паддаўся хвалі, якая захапіла яго волю, кінула ў пропасць пачуццёвага агню. Сам вінаваты, не стрымаўся, сам і адказвай за свой учынак. А што адказваць, калі за яго ўжо ўсё рашылі. Вось засталося толькі Люсі расказаць, а хутчэй за ўсё, яна знае аб рашэнні бацькі. Нельга дапусціць, каб адзіная дачка мела хоць якую-небудзь парушынку на рэпутацыі. Валодзі здалося, што ўсё будзе добра і прыгожа, Люся яго любіць, бацькі яе яго прымуць, як роднага сына, ён жа неблагі хлопец. Гэтыя думкі круціліся ў галаве, яны нейкім важным пластом накладваліся на самае галоўнае: у яго ёсць дзяўчына, студэнтка педінстытута, яна зараз у дзіцячым аздараўленчым лагеры зарабляе капейчыну. Прыгажуня, з ямачкамі на шчоках, з сінімі-сінімі вачыма, з валасамі – ільном. Сур’ёзная і гордая, яе любіць уся рота, увесь ансамбль. Калі хто атрымае пасылку, дык самае смачнае для яе прыхавае. Як жа ёй сказаць аб сваёй здрадзе? З ёю нельга хітрыць, трэба праўда. За што ж так Люся мяне пакарала? Яна ж знала аб маім каханні. Чаму ж я пайшоў за ёй, паддаўся і пра ўсё забыў?

Нейкая нядзеля, другая прабегла хутка. Нават касцюма не купілі, быў у салдацкай форме. Люся ўся сіяла, яна не заўважала нічога і нікога. Яна “адбіла” Валодзю хутка і лёгка, вось ён ужо і муж. Маці, бацька, некалькі гасцей павіншавалі, пасядзелі за сталом, пакрычалі: “Горка”. Валодзя пабыў з жонкай час, адведзены яму як маладажону, і вярнуўся ў часць даслужыць месяц – другі.

Часта думкі нейкім сумам набягалі на яго, рабілі нярвовым, злосным, пісьмо-адказ ад колішняй сваёй каханай захаваў пад пагон, перачытваў, нават радаваўся, што яго пісьмо да яе не дайшло, што яна нічога не знае. Але яна знала, што ў іх з Люсяй атрымалася, прачытала з пісьма, не знала толькі дзень іх вяселля. Яна бачыла, як увіхалася гэтая Люська-школьніца каля яе Валодзі, але надзея на сілу кахання была мацней за рэўнасць, падазронасць. Вось і адказ напісала звычайны. Гэтым як бы пакідала за сабой і ім надзею, пакідала магчымасць на сустрэчу, на вяртанне.

Жыццё ў Люсі з Валодзем не заладзілася. Дайшло да таго, што пабіў Валодзя свайго цесця-начальніка, выбіў яму сківіцу, накрычаў на цешчу, пакінуў жонку і пайшоў на кватэру, бліжэй к заводу, дзе ўладкаваўся працаваць. Люська бегала, звала дамоў. Ён не вярнуўся. Сышоўся з жанчынай, сыходзіў ад яе, зноў вяртаўся. Ён шукаў сваю беларусачку з сінімі вачыма. Не знайшоў.

Знайшла яна яго цераз сваю аднакурсніцу, калі прыехала на курсы. Пры размове пачалі ўспамінаць знаёмых, хто дзе працуе, жыве. Валодзя жыў побач. Заспяшаўся на сустрэчу. Абое хваляваліся, нічога не гаварылі, глядзелі і трымаліся за рукі, як некалі. Можа што б і атрымалася з іх сустрэчы, але ў яго хлынула кроў, заліла ёй твар, рукі, напоўніла яе сэрца страхам і нараканнем “Не цячэ рака назад, а цячэ наперад” – увесь час думалася ёй.

Тая сустрэча была першай і апошняй. Кожны з іх зразумеў: разам ім не быць.

ЦІ МОЖНА ТАК?

На працадуру сядзела некалькі жанчын, мужчына з газеткай у руках. Чарга няспешна пасоўвала да дзвярэй, з якіх выходзілі знаёмыя і незнаёмыя людзі, некаторыя

віталіся, перакідваліся словам, пытаннем: “Як здароўе?”. К нашай чарзе дабаўляліся яшчэ людзі, вялі ціхую гаворку. Хутка да мяне дайшлі словы, што так вось жыццё распарадзілася. Але слухаць далей ужо не было як, мяне запрасілі ў кабінет. Тут мяне ўсадзілі на крэселка, ногі прыйшлося апусціць у ваду з лекамі, пасыпаўся пясок у часах, вочы самі прыкрыліся ад спакою і цяпла. А дзве маладзенькія санітарачкі працягвалі сваю размову, пачатак якой я пачула за дзвярыма. Гісторыя мяне ўразіла сваім трагізмам, я пачала даваць патрэбны ход нашай размове, раз-пораз ўставіўшы пытанні. Жанчына, аб якой вялася размова, была з бліжайшай вёскі, яе добра зналі, таму і прынялі блізка да сэрца ўсе падзеі. Некалі гэтая жанчына ўзяла да сябе жыць мужчыну, быццам, на кватэру. Што казаць, любіў ён выпіць чарку, мог і пабіцца нізашто з такімі ж, як ён, выпівохамі. Хаты не меў, аддаў быўшай жонцы, сам жыў у прыбудовачцы, адзеты быў з чужога пляча, але чыста, грошай многа не зарабляў. Вось і прыбіўся ён да жанчыны. Усе гаварылі, што яна нейкая не ў сабе, але з мужчынай зажыла спраўна. З’явілася і гаспадарка, і соткі засаджвалі бульбай, і нейкае свінчо, і кароўка. А потым і дзіця нарадзілася. Дзяўчынка была. Ціхая, нейкая непрыкметная, у маці. Так і ішло іх жыццё. Памалу ўсё перайшло на плечы мужа, усё на яго рукі. Маці і дачка нічога ў доме не рашалі, не ўмелі, а можа і не хацелі, мужчына знаў, што купіць з яды, з адзежы, да якога доктара весці тую, ці другую. Людзі здзіўляліся яго пакладзістасці, самаахвярнасці. Іншыя гаварылі, што дабром гэта не скончыцца. Так яно і здарылася. За некалькі дзён згарэў мужчына. Ад чаго і як – ніхто не знае, бо да яго ўрача яны не вызывалі. Пасядзеўшы над ім, ціха ўтаропіўшыся ў

полымя свечкі, пахаваўшы пры дапамозе суседзяў, яны як бы затаіліся ў доме. Потым маці прадала сёе-тое людзям, грошы пакінула на помнік, прыбрала дачку, сама пераадзелася ў чыстае. Іх бачылі, як яны двое накіраваліся ў бок ракі Бярэзіны. Ніхто благога не падумаў. Толькі рыбакі здалёк бачылі, што маці, узяўшы дачку за руку, увайшла ў раку, пастаяла, як бы развітваючыся са светам, і пайшла ўсё глыбей, вядучы за сабой і дачку. Так і забрала іх дваіх вада. Відаць, не змаглі яны без мужчыны, без яго апекі і падтрымкі, жыццё стала нялюбым.

Мы доўга маўчалі, працадура была закончана. На сэрцы застаўся смутак: "Чаму ж людзі так распараджаюцца сваім жыццём? Ці ж можна так?"

Два одиночества.

На скамейке судачат: "Говорят, для неё он окацию обломал." "Нет она любит белую сирень. На рынке, видно, покупал." Так часто слышны разговоры в её адрес, а всё потому что ей перевалило за семьдесят. Волосы уже не струются тяжёлой косой, просто скромно уложены вокруг головы. Но походка всё же напоминает гордую женщину. И вот в её жизнь, казалось, давно уже тихую и спокойную вошла другая одинокая жизнь. И вот он как в молодости носит ей букеты любимой белой сирени на глазах всего двора, почтительно целует руку, смотрит в глаза: "Всё ли так сделал?" Её сердце начинает стучать мазурку, она придерживает его рукой, глазами благодарит и приглашает в дом на чашечку кофе. В редкие приходы

они оба разрешают себе такую роскошь. Время не надо торопить оно само бежит. Два одиночества неторопливо вспоминают вслух ушедшие годы. Эти воспоминания не обижают друг другу, всё перегорело и погасло, как костёр. Только вот остались искорки в душе, и они ещё горят слабым огоньком. Этот огонёк даёт нить разговору. Раскрывает давнюю картину жизни. Так тихо идут их вечера. Часто соседи видят их гуляющими по скверу. Он осторожно ведёт под руку свою нечаянную подругу.

Ах, какя сладкая зависть зависает в груди, глядя на них. Бог высоко, а видит далеко и умножит их годы.

Содержание:

Для сябе і пра сябе ўслых 2

Свет любви

О любви 4
Стары друг 4
Разлука 5
Три слова 5
“Хацела б я па вечарах…” 6
Он такой 7
А вы не спросили 7
Сила 8
Она просила 8
«Не встречайтесь с первой любовью…» 9
«Море плещет о берег…» 9
Сирени ветки хмельные 10
«К тебе одной летит моя мечта…» 11
«Вы говорили…» 12
«Не правда ли…» 12
«Когда мучит тоска…» 13
О любви 14

Цыкл “Жаночы лёс”

Кара лёсу 16
Боль сэрца 17
Не цячэ рака назад 19
Ці можна так? 21
Два одиночества 23

Редактор Н.В. Дыдышко
Худ. оформление Н.И. Гер-Пашкевич
Компьютерный набор О.В. Кумакова
30 экз.